# Асаблівасці стылістычнага афармлення і іканаграфіі лічманаў ВКЛ[1]

Дзмітрый МАЦЕША



Член ГА «Беларускае нумізматычнае таварыства», Рэспубліка Беларусь, г. Мінск, e-mail: d.matsesha@gmail.com

З заканчэннем Сярэднявечча надыходзіць час росквіту навукі і мастацтва. Пачынаецца эпоха Адраджэння, падчас якой развіваюцца новыя формы выяўленчага мастацтва. Сярод іх – медальерства, нароўні з якім развіваецца выяўленчае мастацтва пры распрацоўцы знешняга выгляду манет і падліковых жэтонаў.

У Вялікім Княстве Літоўскім, Рускім, Жамойцкім і іншых зямель (далей – ВКЛ) з сярэдзіны XVI ст. апроч распаўсюджаных заходнееўрапейскіх выкарыстоўваліся і тутэйшыя прыватныя падліковыя жэтоны, якія называліся лічманамі (польск. – «liczman»[2]), і падскарбуўкі (польск. – «podskarbiówka»[3]).

На віленскай мынцы, дзе білася большасць лічманаў, працавалі майстры з Заходняй Еўропы (пераважна з Нямеччыны). У выніку іх працы знешні выгляд лічманаў ВКЛ адлюстроўвае заходнееўрапейскія манетныя традыцыі. Такім чынам, перайманне тэхналогій цягнула за сабой і перайманне выяўленчых традыцый і плыняў. Таксама на «дызайн» лічманаў ВКЛ паўплывалі майстры з Італіі, якія з'явіліся пры вялікакняскім двары пасля шлюбу вялікага князя літоўскага Жыгімонта I Старога (1506–1548) з Бонай Сфорца, дачкою міланскага герцага Джавані-Галеаца Сфорца.

Увогуле ВКЛ у XVI ст. з'яўляецца сапраўднай еўрапейскай дзяржавай як геаграфічна, так і ментальна, таму цывілізацыйны ўплыў адчуваецца амаль ва ўсіх сферах жыцця краіны. Аб гэтым сведчаць шматлікія змены – гэта і прыняцце ўдзелу часткі насельніцтва (шляхты) у палітычным жыцці праз дзеянне прадстаўнічага органа ўлады – парламента-сойму, самакіраванне гарадоў праз Магдэбургскае права, распаўсюджванне ведаў, развіццё навукі і рэлігіі шляхам кнігадрукавання, якое распачаў Францыск Скарына, рэфармацыя, развіццё заканадаўства (выданне Статутаў ВКЛ – дасканалых помнікаў права, якія выкарыстоўваліся да сярэдзіны XIX ст.). Апроч гэтага, дзеці заможных шляхцічаў выязджалі па атрыманне адукацыі ў Заходнюю Еўропу.

Лічманы ВКЛ XVI–XVII стст. з'яўляюцца адметнымі помнікамі нашай гісторыі і культуры. У артыкуле мы разгледзім знешні выгляд лічманаў, прааналізуем іх падабенства з манетамі і падліковымі жэтонамі Еўропы.

Сярод элементаў афармлення лічманаў ВКЛ можна вылучыць тры асноўныя групы – гэта мастацкія, геральдычныя і эпіграфічныя. Разгледзім і параўнаем іх з іншымі жэтонамі і манетамі.

## Мастацкія элементы афармлення лічманаў ВКЛ

Майстры віленскай мынцы выкарыстоўвалі іканаграфічныя элементы, падобныя да заходнееўрапейскіх. Так, мы можам параўнаць рэверс падліковага жэтона эрцгерцага Аўстрыі Карла 1569 г. *(малюнак 1)* з рэверсам падскарбувак Дзмітрыя



*Падліковы жэтон эрцгерцага Аўстрыі Карла, 1569 г.*

***Малюнак 1***

*[1] Аўтар выказвае шчырую падзяку за дапамогу ў падрыхтоўцы дадзенага артыкула супрацоўнікам Гродзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага музея, Нацыянальнага музея ў Варшаве (Muzeum Narodowe w Warszawie), Нацыянальнага музея ў Кракаве (Muzeum Narodowe w Krakowie oddział Muzeum im. Emeryka Hutten-Czapskiego). Аўтар будзе ўдзячны за любыя звесткі аб падліковых жэтонах ВКЛ з тэрыторыі Беларусі і іншых краін. Наяўную інфармацыю з фотаздымкамі можна дасылаць на электронную скрыню.*

*[2] Прыватны падліковы жэтон свецкай або духоўнай асобы.*

*[3] Падліковы жэтон, які выкарыстоўвалі ў дзяржаўным або каралеўскім скарбе.*

Халецкага 1595 г. *(малюнак 2)*, на якіх выкарыстоўваюцца падобныя элементы – раслінныя матывы ў выглядзе галінак, размешчаных пад сентэнцыяй.

Таксама лічманы ВКЛ мелі падобныя рысы з заходнееўрапейскімі лічманамі. Разгледзім, напрыклад, лічман субарандатараў віленскай мынцы (1584–1588) Пракопа і Даніэля Вяльковічаў *(малюнак 3)* і падліковы жэтон (рэхенпфенінг) Рудольфа II, імператара Свяшчэннай Рымскай імперыі, эрцгерцага Аўстрыі *(малюнак 4)*. На абодвух мы бачым падобную выяву анёла, які трымае гербавыя тарчы. На падліковым жэтоне (рэхенпфеннігу) графа Георга Эрнста фон Хеннэберг-Шлейзінгена, выбітым у гонар шлюбу з Элжбетай фон Вюртэмберг *(малюнак 5)*, таксама размешчаны анёл як выканаўца ролі тарчатрымальніка.



*Выявы рэверсаў падскарбувак Дзмітрыя Халецкага, 1595 г.*

***Малюнак 2***



*Лічман Пракопа і Даніэля Вяльковічаў, 1580 г.*

***Малюнак 3***



*Падліковы жэтон (рэхенпфенінг) Рудольфа II, 1601 г.*

***Малюнак 4***



*Падліковы жэтон (рэхенпфенніг) графа Георга Эрнста фон Хеннэберг-Шлейзінгена*

***Малюнак 5***

Вышэй мы згадвалі пра ўплыў італьянскіх майстроў на стылістычнае афармленне лічманаў ВКЛ. Так, на лічманах вельмі часта мы бачым абводку з кветак лілії і гербавую тарчу ў выглядзе скручанага аркуша. Падобную абводку можна пабачыць на медалі 1546 г. працы італьянскага майстра Джаванні Джакома Каральо, прыдворнага ювеліра і медальера вялікіх князёў літоўскіх Жыгімонта I Старога і Жыгімонта II Аўгуста (1548–1572) *(малюнак 6)*. Тыя ж элементы размешчаны на падскарбуўцы і буйной манеце Жыгімонта II Аўгуста наміналам у трыццаць грошаў (паўкапы) (*малюнкі 7* і *8* адпаведна), лічмане кіраўніка віленскай мынцы ў 1555–1565 гг. Габрыэля Тарло *(малюнак 13)*.

На манетах і лічманах ВКЛ меліся аднолькавыя іканаграфічныя элементы. Манетны знак у выглядзе трылісніка змяшчаўся на шэлягу ВКЛ часоў пана-



*Медаль з выявай Боны Сфорца, 1546 г.*

***Малюнак 6***



*Падскарбуўка Жыгімонта II Аўгуста, 1564 г.*

***Малюнак 7***



*Паўкапы Жыгімонта II Аўгуста, 1564 г.*

***Малюнак 8***



*Шэляг ВКЛ, 1583 г.*

***Малюнак 9***

вання Стэфана Баторыя (1576–1586) *(малюнак 9)*, лічмане练копа і Даніэля Вяльковічаў *(малюнак 3)* і на лічмане Яна Абрамовіча, старасты лідскага і ваяводы менскага, кіраўніка віленскай мынцы ў 1581 г. *(малюнак 19)*.

З XV ст. на падліковых жэтонах пачынаюць з'яўляцца партрэты ўладароў і вяльможаў. Сярод партрэтных лічманаў ВКЛ можна згадаць лічман Жыгімонта II Аўгуста 1564 г. *(малюнак 10)*. Але гэта адзінкавы вядомы нам асобнік такога тыпу лічмана. Звычайна на лічманах замест партрэта змяшчаецца герб яго замоўцы, пра гэта гаворка пойдзе ніжэй.

### Геральдычныя элементы афармлення лічманаў ВКЛ

На падскарбуўках з прыгожа аздобленымі гербамі знаходзяцца хелмы з пер'ем паўліна *(малюнак 11)* і страуса *(малюнак 12)*, картушам, лаўрамі. Пасродкам такіх знешніх праяўленняў на лічманах нашы продкі атаясамлівалі сябе з еўрапейскім набілітэтам, у якім кожны чалец павінен мець родавы герб з неабходнымі геральдычнымі атрыбутамі. Трэба адзначыць, што з пачатку чаканкі лічманаў на іх змяшчаліся простыя, аднапольныя гербы, а з 1570-х гг. нараўне з простымі на лічманах змяшчаліся і складаныя, чатырохпольныя гербы з выявамі акрамя герба па мячу, то бок па бацьку, таксама гербаў продкаў па жаночай (матчынай) лініі, то бок па кудзелі. Гербы змяшчаліся на палях у адмысловым парадку – злева направа: 1) уверсе злева – герб бацькі; 2) уверсе справа – герб маці; 3) унізе злева – герб бабкі па мячу; 4) унізе справа – герб бабкі па кудзелі.

Падобныя адзін да аднаго геральдычныя элементы меліся на лічманах ВКЛ і еўрапейскіх манетах, што сведчыць аб уплыве заходнееўрапейскіх традыцый на стылістычнае афармленне лічманаў ВКЛ. У якасці прыкладу можна прывесці лічман Габрыэля Тарло *(малюнак 13)* і грошэн (1/24 талера) графства Ліппэ-Дэтмольд *(малюнак 14)* з падобнымі крыламі над хелмамі. На талеры Заходняй Фрызіі *(малюнак 15)* таксама размешчаны герб з хелмам і лаўрамі, падобны да тых, што змяшчаюцца на лічманах ВКЛ.

Цікавыя падскарбуўкі пакінуў пасля сябе падскарбі вялікі літоўскі (1580–1586), менскі



*Партрэтны лічман Жыгімонта II Аўгуста, 1564 г.*

***Малюнак 10***



*Лічман Габрыэля Тарло, 1564 г.*

***Малюнак 13***



*Падскарбуўка Андрэя Завішы, датаваная 1595 г.*

***Малюнак 11***



*Грошэн графства Ліппэ-Дэтмольд, 1612 г.*

***Малюнак 14***



*Падскарбуўка Тэадора Скуміна Тышкевіча, 1586 г.*

***Малюнак 12***



*Талер Заходняй Фрызіі, 1587 г.*

***Малюнак 15***

кашталян (1572–1580) Ян Глябовіч. На падскарбуўцы 1582 г. *(малюнак 17)* змешчаны яго шлюбны герб, які быў збудаваны так: 1 – уласны герб Глябовічаў, 2 – герб яго жонкі Кацярыны Кратоўскай, 3 – герб яго маці княжны Ганны Заслаўскай, 4 – герб маці жонкі Ганны Патуліцкай.

Вышэйназваныя лічманы ВКЛ падобныя па стылістычным афармленні адзін да аднаго – на іх змешчаны герб уладальніка, яго прозвішча і імя або ініцыялы, пасада, сентэнцыя. Але трэба ўзгадаць пра лічманы майстроў мынцы ў Тыкоціне *(малюнак 18)*, якія з'яўляюцца выключэннем з шэрагу лічманаў ВКЛ і адрозніваюцца ад прыватных лічманаў, бо на іх змяшчаюцца толькі герб «Калюмны» і дата з зоркай з правага боку. Магчыма, такога «дызайну» было дастаткова для правядзення выключна падлікаў на мынцы, а прыватныя лічманы выкарыстоўваліся акрамя лічэння таксама і для іншых мэт.

## Эпіграфічныя элементы афармлення лічманаў ВКЛ

На лічманах ВКЛ іх уладальнікі размяшчалі свае імя і прозвішча або ініцыялы, пасаду. У сярэдзіне рэверса звычайна змяшчалася рэлігійная сентэнцыя або дэвіз роду ўладальніка. Так, на рэверсе лічмана Яна Абрамовіча, старасты лідскага і ваяводы менскага, кіраўніка віленскай мынцы ў 1581 г., у цэнтры змешчаны яго ініцыялы I(oan) A(bramowicz), ніжэй – сентэнцыя DEXTERA / TVA SALVA / BIT ME / DEVS (лац.: «Выратуе нас правіца Твая, Божа»), а вакол па краі надпіс: FORTVNA DEI PEDISEQVA (лац.: «Шчасце ідзе Божым следам») *(малюнак 19)*. Такім чынам, можна зрабіць выснову, што некалькі стагоддзяў назад нашы продкі былі набожнымі хрысціянамі і імкнуліся жыць па запаветах Божых.

Уладальнікі заходнееўрапейскіх падліковых жэтонаў таксама змяшчалі свае імя і прозвішча, рэлігійныя сентэнцыі на жэтонах. Напрыклад, на падліковым жэтоне (rechenpfennig) саксонскага герцага Лукаса фон Тангеля *(малюнак 20)* змешчаны яго імя і прозвішча, герб (аверс), сентэнцыя ID FACERE LAVS EST QVOD DECET NON QVOD LICET (лац.: «То рабіць пахвальна, што належыць, а не тое, што дазволена (законам)») (рэверс).

Звычайна пры напісанні тэксту на лічманах карысталіся лацінскай мовай. Так, на падскарбуўцы Яна Глябовіча 1582 г. *(малюнак 17)* для легенды выкарыстана лацініца, сентэнцыя прысутнічае таксама на лацінскай мове. Рэверс: у сярэдзіне поля – надпіс NOS / DEXTERA / TVA DEVS / SALVABIT (лац.: «Выратуе нас правіца Твая, Божа»), вакол – надпіс: IOA(nus) NICO(laus) GEOR(gius) HLEBOWICZ CAS(tellanus) MIN(scensis) TES(aurarius) M(agni) D(ucatus) L(itvanie) (лац.: Ян Мікалай Георг Глябовіч кашталян менскі, падскарбі Вялікага Княства Літоўскага). Але існуюць і выключэнні. На падскарбуўцы вышэйзгаданага Яна Глябовіча 1581 г. *(малюнак 16)* для напісання імя, прозвішча і пасады



*Падскарбуўка Яна Глябовіча, 1581 г.*

***Малюнак 16***



*Падскарбуўка Яна Глябовіча, 1582 г.*

***Малюнак 17***



*Лічман майстра мынцы ў Тыкоціне, 1567 г.*

***Малюнак 18***



*Лічман Яна Абрамовіча, 1581 г.*

***Малюнак 19***



*Падліковы жэтон (rechenpfennig) саксонскага герцага Лукаса фон Тангеля, 1575 г.*

***Малюнак 20***

выкарыстана польская мова: IAN HLEBOWICz NA DABROWNIE CASTEL(an) MINSK(i) PODSKAR(bi) ZIEM(ski) I PISARz W(ielkiego) X(ięstwa) L(itewskiego) («Ян Глябовіч на Даброўне, кашталян менскі, падскарбі земскі і пісар Вялікага Княства Літоўскага»), сентэнцыя адсутнічае.

Адметныя рысы ёсць таксама на лічмане Габрыэля Тарло, родавы дэвіз якога напісаны на нямецкай мове: ALLES / ZV SEIN / ER ZEIT («Усяму свой час») *(малюнак 13)*.

Увагі заслугоўвае тое, што майстры на віленскай мынцы выкарыстоўвалі тыя ж прыёмы пры напісанні тэксту легенды, што і іх заходнія калегі. Так, на вышэйзгаданым талеры Заходняй Фрызіі 1587 г. *(малюнак 15)* у легендзе злучаны ў адзін знак літары AE, а ў падскарбуўцы Лаўрына Войны ў адзін знак злучаны літары AV *(малюнак 21)*.

Часта пасля тэксту сентэнцыі на лічманах змяшчалася дата, напрыклад на *малюнку 21* маецца «ANNO 1577». Гэта скарочанае пазначэнне на лацінскай мове поўнай арыгінальнай фразы «anno Domini nostri Jesu Christi», што перакладаецца як «у год Госпада нашага Ісуса Хрыста». На невялікай колькасці



*Падскарбуўка Лаўрына Войны, 1577 г.*

***Малюнак 21***

лічманаў дата змяшчаецца па баках ад манаграмы, партрэта *(малюнкі 7, 10)*. Таксама дата змяшчаецца на медалях і манетах *(малюнкі 6, 8, 15)*.

Улічваючы вышэйзгаданыя асаблівасці стылістычнага афармлення лічманаў ВКЛ, можна зрабіць выснову, што значны ўплыў на іх аказалі еўрапейскія медальерная і манетная традыцыі, а прыёмы і выявы, якімі карысталіся мюнцмайстры, адпавядалі агульнапрынятым еўрапейскім нормам і правілам.

***Бібліяграфічны спіс:***


1. *Demel, B. Liczmany mennicze zwane podskarbiówkami / B. Demel. – Kraków, 1911.*
2. *Drożdż, K. Podskarbiówki i liczmany Rzeczypospolitej Oboiga Narodów i z Rzeczypospolitą powiązane / K. Drożdż. – Warszawa, 2014.*
3. *Ivanauskas, E. Lietuviški skaičiavimo žetonai 1546–1615 / E. Ivanauskas. – Kaunas, 2014.*
4. *Prokisch, B. Die sammlung österreichischer raitpfennige des 16. und 17. jahrhunderts im Oberösterreichischen Landesmuseum in Linz / B. Prokisch. – Linz, 2000.*
5. *Гулецкі, Д. Помнікі працы майстроў Віленскае мынцы пачатку XVI стагоддзя: аспекты вытворчасці / Д. Гулецкі // Банкаўскі веснік. – 2006. – № 4. – С. 34–41.*
6. *Зянькові, У. Старонкі з гісторыі лічманаў / У. Зяньковіч // Калекцыянер: зборнік артыкулаў. – Мінск, 2014. – С. 110–119.*
7. *Какареко, В.И. Монеты Великого княжества Литовского 1492–1707 / В.И. Какареко, И.Н. Шталенков. – Минск, 2005.*
8. *Матеша, Д. Счетные жетоны XVI–XVII вв. в собраниях на территории Беларуси / Д. Матеша // Банкаўскі веснік. – 2018. – № 2. – С. 24–28.*
9. *Шаланда, А. Таямнічы свет беларускіх гербаў: Шляхецкая геральдыка Вялікага княства Літоўскага / А. Шаланда. – Мінск, 2014.*
10. *Warszawskie Centrum Numizmatyczne Marek Kondrat [Zasób elektroniczny] // Muzeum Narodowe w Krakowie. – Tryb dostępu: www.wcn.pl. – Data dostępu: 01.11.2021.*
11. *Muzeum im. Emeryka Hutten-Czapskiego [Zasób elektroniczny] // Muzeum Narodowe w Krakowie. – Tryb dostępu: mnk.pl/oddzial/muzeum-im-emeryka-hutten-czapskiego. – Data dostępu: 01.11.2021.*
12. *Aukcje na OneBid [Zasób elektroniczny] // One.bid. – Tryb dostępu: www.onebid.pl. – Data dostępu: 01.11.2021.*
13. *MA-Shops – The World's Most Trusted Numismatic Marketplace [Zasób elektroniczny] // MA-Shops. – Tryb dostępu: www.ma-shops.ru. – Data dostępu: 01.11.2021.*
14. *GN Damian Marciniak [Zasób elektroniczny] // Gabinet Numizmatyczny D. Marciniak. – Tryb dostępu: aukcje.gndm.pl/pl/medale-bona-sforza-medal-1546-caraglio-rzadkosc/244470. – Data dostępu: 01.11.2021.*
15. *Zamek Królewski w Warszawie [Zasób elektroniczny] // Zamek-krolewski. – Tryb dostępu: www.kolekcja.zamek-krolewski.pl. – Data dostępu: 01.11.2021.*


## Peculiarities of Stylistic Decoration and Iconography of the counting tokens (liczmans) of the Grand Duchy of Lithuania

**Dzmitry MATSESHA,** *Member of the Public Association «Belarusian Numismatic Society», Minsk, Republic of Belarus, e-mail: d.matsesha@gmail.com.*

**Abstract.** *The article analyses the appearance of the counting tokens (liczmans) of the Grand Duchy of Lithuania. The features of their stylistic decoration and iconography are considered as well. Taking into account peculiar features of the counting tokens (liczmans) decorations, the author makes a conclusion that they were significantly influenced by the European traditions of medals and coins production, while the methods and images used by the mint masters were in line with the generally accepted European norms and rules.*